Зацвярджаю
Дырэктар Дзяржаўнай установы
"Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка"
26.04.16 Л.В.Гурыновіч

Палажэнне
аб правядзенні Майскіх Віткаўскіх чытанняў у Дзяржаўнай установе
"Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка"

1. Агульныя палажэнні

1.1.Сапраўднае Палажэнне вызначае статус, мэты, парадак арганізацыі і правядзення Майскіх Віткаўскіх чытанняў (далей Чытанні) "Мая радзіма – Случчына".
1.2. Арганізатарам раённых Чытанняў з'яўляецца дзіцячы аддзел Дзяржаўнай установы "Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка".
1.3. Чытанні праводзяцца ў рамках краязнаўчага праекта "Слуцк – валошка ў вянку Беларусі" і ў адпаведнасці з планамі мерапрыемстваў Дзяржаўнай ўстановы "Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка".

2. Асаблівасці Чытанняў

2.1. Чытанні - гэта непаўторная, неруцінная, унікальная дзейнасць з усталяванымі тэрмінамі і механізмам рэалізацыі. Пад Чытаннямі разумеецца таксама лагічная сукупнасць мерапрыемстваў, якія ажыццяўляюцца для дасягнення пастаўленых мэтаў у сціслы тэрмін згодна плана - графіка рэалізацыі і прагназавання вынікаў.

3. Мэта і задачы Чытанняў:

3.1. Аб'яднанне паэтычнай супольнасці горада і раёна, аматараў паэзіі, знатакоў твораў Васіля Віткі з іншых рэгіёнаў.
3.2. Фарміраванне прэстыжу беларускай кнігі. Далучэнне случчан да чытання лепшых узораў класічнай літаратуры і павышэнне чытацкай культуры.
3.3. Вывучэнне ўплыву кнігі і чытання на культурны патэнцыял насельніцтва.
3.4. Выяўленне і развіццё творчых і інтэлектуальных здольнасцей дзяцей.
3.5. Арганізацыя карыснага вольнага часу грамадзян. Прыцягненне патэнцыйных чытачоў у бібліятэкі.
3.6. Прыцягненне ўвагі грамадскасці і органаў улады да праблем чытання і бібліятэкі як культурнага цэнтра.

4. Заснавальнікі Чытанняў. Арганізацыя Чытанняў.

4.1. Арганізатарам Чытанняў з'яўляецца Дзяржаўная ўстанова "Слуцкая раённая цэнтральная бібліятэка".
4.2. Партнёрамі Заснавальніка Чытанняў з'яўляюцца Аддзел адукацыі, спорту і турызму Слуцкага райвыканкама, рэдакцыя часопіса "Вясёлка", Саюз пісьменнікаў Беларусі, бібліятэкі іншых устаноў і ведамстваў.

4.3. Для правядзення чарговых Чытанняў ствараецца аргкамітэт, у задачу якога ўваходзіць распрацоўка рэгламентыруючых дакументаў, рашэнне арганізацыйных і фінансавых пытанняў, стварэнне грамадскага іміджу Чытанняў.

## 5. Тэрміны і месца правядзення Чытанняў

5.1. Чытанні праводзяцца кожны год у рамках Тыдня папулярызацыі творчасці Васіля Віткі, які пачынаецц 16 мая ў дзень нараджэння пісьменніка.
5.2. Адкрыццё Чытанняў праводзіцца ўрачыста з запрашэннем ганаровых гасцей.
5.3. Чытанні праводзяцца ў Слуцкай раённай бібліятэцы і бібліятэках-філіялах.
5.4. Пляцоўка для правядзення мерапрыемстваў у рамках Чытанняў не абмяжоўваецца памяшканнямі бібліятэк.

## 6. Удзельнікі Чытанняў

6.1. Удзельнікамі Чытанняў могуць стаць усе жадаючыя.
6.2. Узрост і сацыяльны статус удзельнікаў Чытанняў не абмежаваны.

## 7. Фармат правядзення Чытанняў

7.1. Формы правядзення Майскіх Віткаўскіх чытанняў не абмежаваны ўмоўнымі рамкамі. Магчыма ўдасканаленне і развіццё праекта праз ўкараненне новых формаў і метадаў работы.

## 8. Рэклама вынікаў Чытанняў

8.1. Бібліятэкі распрацоўваюць самастойныя планы і праграмы па папулярызацыі кніг, правядзенне публічных мерапрыемстваў, звязаных з жыццём і творчасцю Васіля Віткі.
8.2. Аргкамітэт Чытанняў рыхтуе і здзяйсняе выпуск бібліяграфічных, рэкамендацыйных і іншых матэрыялаў Чытанняў.
8.3. Інфармацыя аб Чытаннях змяшчаецца на старонках сродкаў масавай інфармацыі, сайтах бібліятэкі і Слуцкага райвыканкама.